# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

22 сакавіка 2023 г. № 10 (696)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


# НАБЫЦЬ НЯДОРАГА — ВЫКАРЫСТАЦЬ У ПОЎНАЙ МЕРЫ

## Сенатары і прадстаўнікі мясцовай улады вывучалі, як вырашаюцца зямельныя і маёмасныя пытанні







Фота БелТА.

**Трапяткое стаўленне да зямлі закладзена глыбока ў менталітэце людзей, у іх гістарычнай памяці, культуры, традыцыях продкаў, а справядлівыя базавыя правілы распараджэння зямлёй — фундамент стабільнасці ў грамадстве. Гэтыя словы Прэзідэнта працытавала Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі, адкрываючы пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі «Аб сумеснай рабоце органаў мясцовага кіравання і самакіравання па вырашэнні праблемных пытанняў у галіне зямельна-маёмасных адносін і навядзенні парадку на зямлі» ў Стоўбцах, дзе парламентарыі азнаёміліся з вопытам вырашэння зямельных пытанняў у раёне: іх уводу ў севазварот, продажу маёмасці іншым карыстальнікам або зносу.**

### Стоўбцы — узорны райцэнтр — агульная праца

Праблемныя пытанні, якія ўзнікаюць, неабходна аператыўна вырашаць. І работа Савета па ўзаемадзеянні наладжана вельмі правільна, калі ты сам прыязджаеш і бачыш, як вырашаюцца пытанні, дзе ёсць недапрацоўкі, якія трэба выправіць, каб было камфортна людзям, а магчымасць аператыўна іх вырашыць ёсць, бо Савет Рэспублікі працуе над законапраектамі і займаецца нарматыўна-прававымі актамі, падкрэсліла Наталля Качанава і дадала:

*— Будаўніцтва жылля, інфраструктура, добраўпарадкаванне выканана ў Стоўбцах выдатна. Калі мы разам выконваем пастаўленыя задачы — ёсць вынік. Нам неабходна больш глыбока і цесна працаваць з дэпутацкім корпусам усіх узроўняў. І члены Савета Рэспублікі на месцах павінны быць каардынатарамі работы ў цэлым, таму што гэта вялікая армія людзей, якія штодня маюць справы з нашымі грамадзянамі. А мясцовы дэпутат блізкі народу, ён жыве побач з людзьмі і разумее ды бачыць, якія ў іх праблемы.*

Стоўбцы — гарадок, які ў Мінскай вобласці можна браць за ўзор таго, як павінен выглядаць райцэнтр. У прыватнасці, праект добраўпарадкавання гарадской экасістэмы Стоўбцаў можа прэтэндаваць на ўзор развіцця малых гарадоў краіны, а ўнікальныя архітэктурныя прыёмы, якія выкарыстаны падчас рэканструкцыі кінатэатра «Беларусь», як і комплексны падыход пры стварэнні спартыўнай інфраструктуры вобласці для рашэння задачы даступнасці дзіцячых дашкольных і навучальных устаноў, ужо сталі візітнай карткай Міншчыны, адзначыў работу мясцовых улад **Аляксандр ТУРЧЫН, старшыня Мінскага аблвыканкама:**

*— Асабліва прыемна сустракаць гасцей сёлета, калі Міншчыне 85 гадоў, хоць як тэрытарыяльна-адміністрацыйная адзінка вобласць сфарміравана амаль 230 гадоў назад (у красавіку 1793-га Кацярына II сваім указам заснавала Мінскую губерню ў складзе Расійскай імперыі). З тых часоў тэрыторыя вобласці зменшылася амаль удвая, аднак вынікаў, якія дэманструе сталічны рэгіён па шэрагу параметраў, не было ніколі. У прыватнасці, тут узводзіцца чвэрць усяго жылля, якое будуецца па ўсёй краіне.*

### Легалізаваць індывідуальную зямлю

Падзел зямельных участкаў, узаконьванне самавольных забудоў і іншыя праблемы, якія назапашваліся ў краіне гадамі, цяпер можна вырашаць на месцах, звяртаючыся да раённых улад, упэўнены ўдзельнікі сустрэчы. З 1 верасня 2022-га ў сілу ўступіў Закон «Аб змяненні кодэксаў», які, у прыватнасці, замацаваў права землекарыстальнікаў набываць зямельныя надзелы, што знаходзяцца ў іх на 1 верасня 2022 года. А з 1 студзеня 2023-га запрацаваў абноўлены Кодэкс аб зямлі. Гэтыя дакументы ў многім вырашаюць праблемныя пытанні ў сферы зямельных адносін.

***(Заканчэнне на 9-й стар.)***

# МЫ САМІ ВЕДАЕМ, ЯК НАМ ЖЫЦЬ

## Заява Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у сувязі з прыняццем Еўрапейскім парламентам рэзалюцыі па Беларусі

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь рашуча асуджае прыняцце Еўрапейскім парламентам чарговай адыёзнай рэзалюцыі ў дачыненні да Беларусі і катэгарычна абвяргае ўсе без выключэння ацэнкі сітуацыі ў нашай краіне. Лічым гэта нечым іншым, як непрыкрытым умяшаннем ва ўнутраныя справы нашай суверэннай і незалежнай дзяржавы, зневажаннем неад'емнага права беларускага народа на самастойнае вызначэнне свайго лёсу.

Адобранае Еўрапейскім парламентам рашэнне непасрэдна супярэчыць Статуту Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і прынцыпам міжнароднага права. Праз ціск на нашу краіну на палітычных пляцоўках, санкцыйны шантаж, інфармацыйна-псіхалагічны тэрор прасоўваецца чалавеканенавісніцкая палітыка, якая мяжуе з крайнім нацыяналізмам.

Відавочная няслушнасць і нелегітымнасць рашэнняў, прынятых на аснове адкрытай хлусні і бруду, якія выліваюць на Беларусь збеглыя здраднікі, што цынічна гандлююць нацыянальнай бяспекай і дабрабытам нашай краіны і народа. Любая калабарацыя з гэтымі злачынцамі паказвае абсалютнае няведанне рэальнага жыцця Беларусі і загадзя асуджаная на правал.

Мы не маем патрэбы ў павучаннях звонку — мы самі ведаем, як нам жыць. Беларусь нязменна прытрымліваецца курсу міралюбнасці, добрасуседства і стваральнай працы. Наша краіна развіваецца па законах, якія поўнасцю адпавядаюць карэнным інтарэсам беларускага народа пры паважлівым стаўленні да ўсіх, хто адкрыты да канструктыўнага дыялогу з намі і мае права чакаць ад іх таго ж.

З упэўненасцю заяўляем, што імкненне заходніх функцыянераў завуаліраваць допушчаныя імі пралікі і памылкі ў кіраванні сваімі краінамі контрпрадукцыйныя і марныя. Прасвятленне еўрапейскай грамадскасці наступіць непазбежна. У бягучых умовах некалі паспяховая Еўропа ахопленая сур'ёзнымі сацыяльна-эканамічнымі праблемамі, а яе насельніцтва выходзіць на вуліцы, каб абараніць свае правы і прадухіліць спаўзанне Еўрапейскага кантынента да поўнамаштабнай вайны.

Усё, што сёння адбываецца ў свеце, — водгалас рэваншысцкай палітыкі. З-за амбіцый прыхільнікаў гэтай палітыкі чалавецтва сутыкаецца з беспрэцэдэнтнымі выклікамі глабальнай нестабільнасці і нявызначанасці.

Заклікаем парламенцкія структуры, Арганізацыю Аб'яднаных Нацый, Міжпарламенцкі саюз, Міжнародную арганізацыю працы і іншыя міжнародныя арганізацыі, Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека і Савет ААН па правах чалавека ігнараваць палітызаванае, беспадстаўнае меркаванне Еўрапейскага парламента ў дачыненні да Беларусі, садзейнічаць развіццю сапраўды дружалюбных адносін і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пацвярджае сваю цвёрдую рашучасць супрацьдзейнічаць любым спробам замаху на суверэнітэт і незалежнасць Беларусі, умяшанню ў яе ўнутраныя справы, палітычнаму, эканамічнаму і іншаму ціску на нашу краіну.

Ніхто, акрамя беларускага народа, не мае права вырашаць, як нам жыць, як развівацца, якім законам быць на нашай роднай зямлі.